УДК 94(4)

# КАТЭГОРЫЯ ЧАСУ І ЯГО ВЫМЯРЭННЕ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ Ў ЭПОХУ СЯРЭДНЯВЕЧЧА

**Хаданёнак Віктар Мамертавіч, кандыдат гістарычных навук,
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь**

Ключавыя словы: час, гадзіннік, сярэднявечча, Заходняя Еўропа, ментальнасць.

Рэферат. У артыкуле разглядаюцца розныя падыходы да асэнсавання і ўспрымання часу ў эпоху сярэднявечча. Асаблівая ўвага надаецца інструментам па вымярэнню часу, гадзіннікам.

Пытанне «Што такое час?» і сёння не мае адназначанага адказу. Астраномы, філосафы, фізікі не могуць знайсці паразумення нават унутры сваёй супольнасці, калі спрабуюць наблізіцца да яго вызначэння. Освальд Шпэнглер увогуле меркаваў, што адказ на яго будзе настолькі ўяўны, што і задаваць такое пытанне не варта [1, с. 165]. Па вялікаму рахунку, у агульнай тэорыі адноснасці Альберта Эйнштэйна, адсутнічае абсалютны час і кожны індывід мае свой асобны маштаб часу, які залежыць ад таго, дзе ён знаходзіцца і якім чынам рухаецца [2].

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца – вызначыць асаблівасці ўспрыняцця часу і спосабы яго вымярэння ў эпоху сярэднявечча ў краінах Заходняй Еўропы.

Успрыняцце часу ў перыяд сярэднявечча (прыблізна V–XV стст.) было крайне неаднародным. Яно адрознівалася ў залежнасці ад перыяда (ранняе, класічнае, позняе сярэднявечча) і ад саслоўнай прыналежнасці яго суб’ектаў. Тым не менш можна прасачыць і нейкае агульнае «сілавое поле» [3], якое пэўным чынам аб’ядноўвала ўсведамленне часу людзьмі і выступала ў якасці найважнейшага атрыбута ментальнасці чалавека.

Само слова «час» выкарыстоўвалася ў эпоху сярэднявечча даволі часта. Пра гэта сведчаць назвы літаратурных і гістарычных твораў: «Кветнік Часу» (Flores temporum) Германа Гігаса, «Пучок часу» (Fascilum temporum) Вернэра Ролевінка [4, с. 5] і інш. Але сэнс, які ўкладаўся ў гэта слова далёка не заўжды быў ідэнтычны.

Жак ле Гоф падзяляе сярэднявечны час на аграрны, сеньёрыяльны і царкоўны [5, с. 221]. Народная ж маса, па меркаванніі французскага медыявіста, не валодала ўласным часам і была нездольна да яго вызначэння. Яна падпарадкоўвалася часу, які абазначалі званы, трубы і рыцарскія рогі [5, с. 217].

Самым вялікім па колькасці саслоўем серадневечнай Еўропы было сялянства. Аграрная форма жыцця падпарадкоўвалася прыродным рытмам, што накладала адбітак на ментальнасць людзей, якая праяўлялася ў асаблівым перажыванні кантраста дня і ночы, зімы і лета [6, с. 158]. Вясковае жыццё было надзвычай

статычным. Паслядоўна змянялі адзін аднаго аграрныя цыклы (сяўба, жніво, забой скаціны), якія паўтараліся без усялякіх зменаў год за годам. Час цягнуўся марудна, а сезонныя сельскагаспадарчыя работы перарываліся, хіба, традыцыйнымі святамі, якія ў сваю чаргу суадносіліся з земляробчым календаром.

Праз тое, што жыццё на вёсцы было няспешным, будзённым, цыклічным і добра прадказальным – дакладна вымяраць час не было патрэбы. Таму асноўнымі адзінкамі вымярэння часу на вёсцы былі – год і месяц, а не дзень, ці гадзіна. Аб'ём і працягласць працы селяніна вызначаўся арганічным адчуваннем змены натуральных прыродных станаў. Дзень падзяляўся на даволі прыблізныя і недакладныя перыяды: раніца, палова дня, вечар [7, с. 45].

Сельскагаспадарчы і, адпаведна, каляндарны год пачынаўся разам з сезоннымі работамі. Цалкам натуральна, што ў паўночнай Германіі і паўднёвай Італіі гэта былі розныя месяцы, з-за істотных кліматычных адрозненняў.

Сялянства, па вялікаму рахунку, было амаль цалкам абыякава да якога-небудзь дакладнага падліку часу. Прасачыць яго пэўную паслядоўнасць дапамагаў у межах адной сям'і, хіба, падлік пакаленняў. Дзякуючы гэтаму вясковае насельніцтва мела хаця бы прыблізнае ўяўленне аб чаргаванні падзей.

Пэўным чынам упарадкаваць час у эпоху сярэднявечча паспрабавала царква. Прычым манаполія ў гэтай справе прывяла да таго, што да XIII–XIV стст. духавенства не толькі абсалютна «кантралявала» яго падлік і вымярэнне, але і мусіла навязаць яго своеасаблівае ўспрыманне сялянам і рамеснікам.

Хрысціянскі час меў эсхаталагічную, лінейную скіраванасць, у адрозненне ад аграрна-цыклічнага часу сялянства. Гісторыя падзялялася на адрэзкі, звязаныя з біблейскімі сюжэтамі. Прычым дакладна быў вызначаны яе пачатак – стварэнне Свету, і канец – другое прышэсце Ісуса Хрыста і Страшны суд. Гэта быў спрэс лінейны час, падпарадкаваны строгаму чаргаванню і паслядоўнасці біблейскіх падзей. Прычым амаль усё мінулае вызначалася як «Залатая эпоха», а ў будучыні нельга было чакаць нічога добрага і светлага. Адсюль пэўны песімізм і фаталізм ва ўспрыняцці ўсяго новага людзьмі эпохі сярэднявечча.

Сацыяльны кантроль над часам фармаваў у свядомасці людзей уяўленне аб часе як уласнасці Бога [6, с. 158]. А раз час належыць Богу, то ён не можа прадавацца. Таму царква выступала рэзка супраць атрымання працэнтаў за карыстанне грошамі. Крэдытныя аперацыі і ўзаконенае ліхвярства былі даволі рэдкай з'явай да XIV ст. Меркавалася, што толькі Бог кіруе часам, бо Ён адзін можа ўбачыць яго ва ўсёй сукупнай працягласці і вымераць катэгорыямі, якія адрозніваюцца ад нашых [8, с. 111].

Тым не менш, царква імкнулася дапасаваць «літургічны» час да часу аграрнага, вясковага. У гэтым ёй дапамагаў бой на царкоўных званіцах, які стаў адным з самых унікальных сімвалаў сярэднявечча. Ён у першую чаргу абазначаў час набажэнства і адпаведна арганізоўваў пэўны рытм жыцця чалавека. Людзі адрознівалі «звон жніва», «звон выгана на лугі», «звон пагрозы» і інш.

Як зазначае Жак Ле Гоф, дзякуючы царкоўнаму звону, хрысціянства дало Захаду

ў VI–VII стст. прынцыпова новы спосаб прасачыць час – акустычны [7, с. 46]. Царква пэўным чынам матэрыялізавала падлік часу, што дазволіла ёй удакладніць і ўніфікаваць перыяды набажэнства. Царква пачынала адлік часу з ютрані (бліжэй да заканчэння ночы), а затым з усходам сонца, адзначала першую гадзіну і далей 3-юю (раніцай), шостую (апоўдні), дзевятую (пасля апоўдня), вячэрню і гэтак званую kompleta hara (канчатковую гадзіну), якая заканчвала дзённае набажэнства. Прычым назвы службаў (першая, трэцяя, шостая і дзевятая гадзіны) абазначалі не дакладныя інтэрвалы, а пэўныя этапы набажэнства і істотным чынам адрозніваліся зімой, вясною і летам [9].

Гарадскі рамесны і гандлёвы люд меў сваё стаўленне да часу, якое зазнала на сабе змены і не было статычным на працягу V–XV стст. Так у раннім сярэднявеччы не назіралася росту гарадоў і гарадскога насельніцтва, а эканамічная актыўнасць была крайне нізкай. Некаторыя гандляры не тое што не лічылі час, а ўвогуле былі слаба знаёмы з арыфметыкай. У першай палове VI ст. біскуп Цэзары Арльскі сутыкаўся ў Правансе з багатымі купцамі, якія не ўмелі ні чытаць, ні пісаць; а праз 150 год валоданне чытаннем і пісьмом ужо лічылася ў Галіі раскошай, якую многія клірыкі і нават біскупы не маглі сабе дазволіць [10, с. 195].

З XII ст. пачынаюцца імклівыя змены ў эканоміцы, якія пэўным чынам адбіваюцца і на ментальных характарыстыках людзей. Змяняецца рытм работы і стаўленне да часу, з'яўляецца неабходнасць яго больш дакладнага вымярэння гарадскім насельніцтвам. Калі гук званоў сімвалізаваў царкоўны кантроль над часам, то гадзіннікі на вежах увасобілі з'яўленне іншай сацыяльнай сілы, раменікаў і гандляроў, якія выступалі супраць царквы ў яе кантролі над часам [6, с. 158].

Сапраўды, час з XII–XIII стст. пачынае разумецца як пэўная каштоўнасць. Імкненне зрабіць як мага больш рэчаў і прадаць больш тавараў за меншы прамежак часу становіцца важным аспектам жыццядзейнасці рамесных майстроў і купцоў. У некаторых гарадах Еўропы ў XIV ст. званы на вежах пачынаюць адбіваць не царкоўны час, а час камерцыйных угод і працы цэхавых майстроў. Бой званоў ужо прымушае задумацца не пра вечнае, пра Бога, а скіроўвае чалавека да вырашэння надзённых і практычных задач яго матэрыяльнага жыцця, больш інтэнсіўнай працы і гандлю.

Калі раней цэхавыя майстры маглі працаваць толькі ў светлы перыяд часу, то з XIV ст. такія абмежаванні здымаюцца. Адпаведна хутка расце колькасць выпускаемай прадукцыі, але пэўным чынам пагаршаецца яе якасць (штучнае асвятленне было кепскім і не дазваляла на высокім узроўні выконваць пэўныя аперацыі). Да таго ж істотна павялічылася колькасць пажараў з-за працы пры свячах. Час становіцца каштоўнасцю і крыніцай багацця.

Спецыфічныя асаблівасці ва ўспрыманні часу былі ў феадальнага салоўя. Сеньёрыяльны час быў шчыльна зніталваны з вайсковымі кампаніямі і бітвамі. Часцяком біблейскія альбо міфалагічныя аспекты светасузірання ўплывалі на аб'ектыўнае ўспрыманне рэчаіснасці. Так, удзельнікі крыжовых паходаў канца XI–XIII стст. меркавалі, што змагаюцца з тымі, хто катаваў Хрыста, а не з іх

нашчадкамі, хоць з гэтага моманту прайшло ужо больш за 1000 гадоў [11].

Для феадалаў надзвычай важная роля адводзілася іх родаваму дрэву, якое давала ім падставу ганарыцца сваім слаўным паходжаннем. Таму тут назіраецца родава-дынастычны, альбо генеалагічны падыход да ўспрымання часу.

Надзвычай цяжка прасачыць эвалюцыю стаўлення да часу ў сераднявечнай інтэлектуальнай эліты. Размаітасць і ўнікальнасць падыходаў не дазваляе прыйсці да якога-небудзь агульнага меркавання. Генрых Аўрылакскі, Аўгусцін, Ансэльм Кентэрберыйскі, П'ер Абеляр, Банавентура, Дунс Скот, Уільям Акам, Мікалай Кузанскі, Фама Аквінскі, Алкуін, Павел Дыякан і інш. сваімі працамі заклалі выдатны падмурак у тэалагічна-хрысціянскае разуменне часу [12].

Прычым у гэтых мысляроў даволі часта храналагічныя тэрміны схаваны за пэўнымі мастацкімі параўнаннямі і алегорыямі. Так Алкуін у сваёй размове з каралём Італіі Піпінам абазначае год як «калясніцу свету», дзень – як «падахвочванне да працы» і т. п. [13, с. 63]. Мясцовы, зямны час разглядаўся праз прызму вечнасці і абсалютных катэгорый, з вялікай доляй сярэднявечнага містыцызму. Разважанні прадстаўнікоў інтэлектуальнай культуры не аказвалі істотнага ўплыву на агульнае светаўспрыманне пераважнай большасці насельніцтва.

Для вечнасці не было ні працягласці, ні скіраванасці. Хрысціянскімі мыслярамі яна ўспрымалася і пачаткам і канцом існавання, пэўным атрыбутам Боскай сутнасці. А час разумеўся як цень вечнасці, які не мае якога-небудзь самастойнага значэння [7, с. 45]. Час і вечнасць выступалі як антыподы, як супрацьлегласць адноснага і абсалютнага.

У прававых помніках, юрыдычнай практыцы і тэстаментах сярэднявечнай Еўропы яскрава прасочваецца тэндэнцыя, што тэрмін «навечна», альбо «на ўсе часы» меў моц толькі на працягу жыцця таго, хто ім карыстаўся. Чалавек не валадарыў над часам, якога не мог фізічна пражыць. Таму нават прывілеі каралёў мусілі абнаўляцца і падцвярджацца пры кожнай змене манарха.

Цяпер ад стаўлення і ўспрымання часу да спробаў і магчымасцяў яго дакладнага вымярэння ў Заходняй Еўропе V–XV стст. У эпоху сярэднявечча, калі пераважаў аграрны лад жыцця і рамесная вытворчасць, проста не было пільнай патрэбы і неабходнасці дзяліць час на дробныя адрэзкі і дакладна іх вымяраць [14, с. 7]. Таму пэўны перыяд актыўна карысталіся сонечнымі гадзіннікамі (гнамонамі) і гэтага было дастаткова. Так, Павел Дыякан у «… геаграфічных звестках аб старажытнай Германіі» (канец VIII ст.) піша: «У Італіі, на святках, а шостай гадзіне (апоўдні) ад мужчыны падае цень даўжынёю 9 футаў. У бытнасць маю ў Бельгійскай Галіі ў мястэчку Татанісвіль, я вымерыў свой цень і знайшоў, што ён меў даўжыню 19 ½ футаў» [4, с. 198].

Як бачым падлікі былі вельмі прымітыўнымі, нават у параўнані з больш раннімі эпохамі. Да таго ж гэта было перш за ўсё прыстасаванне для вызначэння астранамічнага часу, а не вымярэнне яго дакладных адрэзкаў. Сонечны гадзіннік мог паказваць час толькі днём і ў яснае надвор'е, гэта быў яго сур'ёзны недахоп. Акрамя таго, гнамон быў звычайна даволі грувасткім прыстасаваннем, перамяшчаць якое без

шкоды для дакладнасці вымярэння было вельмі праблематычна.

Гнамоны звычайна ўяўлялі сабой пэўны конусападобны ці прамавугольны стрыжань, а шкала для вымярэнняў знаходзілася на зямлі, альбо на адмыслова падрыхтаванай паверхні. Для больш дакладнага вымярэння часу рабілі гнамоны для розных месяцаў года. У 1482 г. У Фларэнцыі быў пабудаваны гнамон вышынёй 84,5 метраў [15, с. 214]. Існавалі і дарожныя сонечныя гадзіннікі, якія размяшчаліся на скрыжаваннях вялікіх трактаў і гасцінцаў.

Яшчэ адным відам гадзіннікаў былі вадзяныя клепсідры (з грэц. мовы «вароўка вады»). Яны ўяўлялі сабой альбо злучаныя колбы, у якіх вада пераліваецца з адной у другую за фіксаваны час, альбо вялікія рэзервуары, злучаныя з натуральнай альбо штучнай плыняй вады.

Мала таго, што клепсідры былі ў асноўным недаступнымі для абсалютнай большасці насельніцтва, так і іх выкарыстанне мела цэлы шэраг нюансаў. Асноўная праблема ў працы клепсідры – змены ў расходах вады з-за рознага ціску вадкасці ў поўным ці напалову поўным сасудзе, калі па меры змяншэння вады, хуткасць яе выцякання замаруджваецца. Пэўным чынам гэта праблема вырашалася праз стварэнне сасудаў канічнай формы. Да таго ж на раўнамернасць выцякання вады аказвала ўплыў розніца паміж дзённай і начной тэмпературай паветра, а таксама якасць вады, так як асадак паступова забіваў выхадную адтуліну [16, с. 422]. За такім відам гадзіннікаў патрабаваўся пастаянны догляд і кантроль.

Шырокай папулярнасцю ў эпоху сярэднявечча карысталіся разнастайныя «агнявыя» гадзіннікі і прыстасаванні. З пачатку XIII ст. сталі актыўна карыстацца «свячным гадзіннікам». Іх рабілі ў выглядзе тонкай свечкі з нанесенымі па яе даўжыні шкаламі. Даўжыня такіх свечак даходзіла да 1-го метра [15, с. 216].

Людовік IX меў у сваім пакоі свячу, якая дасягала 3-х футаў, і пакуль яна гарэла – ён чытаў Біблію. Карл V меў свячу, падзеленую на 24 часткі і пры ім знаходзіліся асоба ўпаўнаважаныя людзі, якія дакладалі яму да якога дзялення дагарэла свяча [14].

Паабапал свячы мацавалі металічныя штыркі, якія па меры выгарання і таяння воска падалі і іх удар па металічнай падстаўцы быў своеасаблівым будзільнікам [15, с. 216]. Але такі спосаб абуджэння быў надзвычай недасканалы. Два ганзейскія гандляры Магнус Шарандс і Феликс Радке своечасова не прыйшлі на заключэнне дагавора аб продажы футра, з-за таго што свечка-будзільнік аднаго з іх была патушана скразняком.

На тэрмін гарэння свячы ўплывала і якасць воска. Такія свечы актыўна прымяняліся духавенствам. Пры каралеўскім двары нават існавала пасада «фрухтмайстара». Ён займаўся пераважна садавінай і дрэвамі, але і адказваў за асвятленне пакояў свечкамі, таму што воск здабываюць пчолы з кветак, якія ён даглядаў [17, с. 274]. У вясковых хатах карысталіся сальнымі свечкамі. А феадалы вымяралі прыблізны час па гарэнню паходні.

У XII–XIII стст. пачынаюць ужывацца «алейныя гадзіннікі». Яны прадстаўлялі сабой лампаду з адкрытай фіцільнай гарэлкай і са шкляной колбай для алея. Пры больш высокім узроўні алею яго ціск выклікаў больш хуткае выгаранне, таму

лампадныя гадзіннікі больш позняга паходжання мелі шкляную колбу ў выглядзе пашыранай да верху грушы [15, с. 217].

Адна з самых старых узгадак пра пясочныя гаддзіннікі адносіцца да 1339 г. У ёй прыводзяцца ўказанні па прыгатаванні тонкага пяску з прасеянага парашка чорнага мармура, які пракіпяцілі ў віне і высушылі на сонцы [15, с. 217]. Пясок, які «цёк» у шкляных сасудах часта асацыяваўся з хуткасцю, канечнасцю і абмежаванасцю чалавечага існавання.

Адной з самых выдатных з'яў эпохі сярэднявечча стала вынаходніцтва механічнага гадзінніка. І сапраўды «гадзіннік, як стварэнне высокаразвітых культур, становіцца тым больш таямнічым, чым болей пра яго разважаеш» [1, с. 174]. Дакладная дата вынаходніцтва механічнага гадзінніка застаецца невядомай, але ў сярэдзіне XIII ст. яны ўжо ўзгадваюцца ў нататках французскага архітэктара Віллара Ханнекурта. У 1288 г. механічны гадзіннік з'яўляецца ў Вестмінстары, а ў пачатку XIV ст. гадзіннікавы механізм манціруецца на вежы палаццо Капітана ў Падуі. На ўсіх першых гадзінніках толькі адна стрэлка, якая фіксуе гадзіны [7, с. 47].

Самым жа старым дакументам аб механічным гадзінніку, які змяшчае іх апісанне і чарцёж, з'яўляецца паведамленне аб астрарыі (астранамічны гадзіннік), які ў 1364 г. распрацаваў прафесар Джаванні дэ Дондзі ў Падуі [15, с. 218]. У гэтага гадзінніка рама была зроблена з бронзы, а валы, колы і цыферблат – з латуні. З 297 частак гэтага гадзінніка 100 складалі колы і шэсцерні, зубцы якіх былі нарэзаны ручным спосабам.

Такім чынам стаўленне людзей да часу ў V–XV стст. не было статычным і залежала ў першую чаргу ад саслоўя да якога належаў чалавек, і, па-другое, ад сацыяльна-эканамічных і культурна-ментальных умоў яго існавання. Прыборы для вымярэння часу былі яшчэ крайне недасканалымі. Але гэта не мусіць нас бянтэжыць, бо нават зараз з-за з'яваў прэцэсіі і нутацыі ўзаемнае размяшчэнне нябеснага экватара і экліптыкі увесь час змяняецца, што прыводзіць да розніцы паміж зорнымі і сонечнымі суткамі [18, с. 9].

Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Шпенглер, О. Закат Европы / Освальд Шпенглер. В 2 т. – Т. 1. – М. : Айрис-пресс, 2003. – 528 с.

2. Хокинг, С. Краткая история времени. От Большого взрыва до черных дыр / Стивен Хокинг. – М. : АСТ, 2019. – 271 с.

3. Сент Экзюпери, А. Цитадель / Антуан де Сент Экзюпери. – М. : Эксмо, 2023. – 320 с.

4. История Средних веков: От падения Западной Римской империи до Карла Великого (476 – 768 гг.) / Сост. М. М. Стасюлевич. – М: АСТ; СПб.: Полигон, 2001. – 496 с.

5. Ле Гофф, Ж. Цивилизация средневекового Запада / Жак Ле Гофф. – Екатеринбург: У-Фактория, 2005. – 568 с.

6. Тихонова, В. Л. Интерпретация времени в пространстве культуры в

исследованиях представителей школы «анналов» и А. Гуревича / В. Л. Тихонова // Учёные записки Орловского государственного университета. Серия: гуманитарные и социальные науки. 2013 г. – № 1. – С. 157–161.

7. Иванов, С. Г. Пространство и время в мировосприятии Средневековья и Возрождения [Текст] / С. Г. Иванов // Известия Российского государственного педагогического университета им. А. И. Герцена. – СПб., 2012. – № 149. – С. 43–51.

8. Хулап, В. «Линия Христа»: время и история в богословии Оскара Кульмана / В. Хулап // Христианское чтение: Научный журнал Санкт-Петербургской духовной академии Русской Православной Церкви. – 2022 г. – № 1. – С. 106–120.

9. Ястребицкая, А. Л. Западная Европа XI – XIII веков. Эпоха, быт, костюм. – М. : Искусство. – 1978. – 176 с.

10. Альфан, Л. Великие империи варваров. От Великого переселения народов до тюркских завоеваний XI века / Л. Альфан. М.: Вече; СПб.: Евразия. – 2006. – 416 с.

11. История Средних веков: Крестовые походы (1096 – 1291 гг.) / Сост. М. М. Стасюлевич. – М: АСТ; СПб.: Полигон, 2001. – 592 с.

12. Коплстон, Ф. История философии. Средние века / Ф. Коплстон. – М.: ЗАО Центрполиграф, 2003. – 494 с.

13. История Средних веков: От Карла Великого до Крестовых походов (768–1096 гг.) / Сост. М. М. Стасюлевич. – М: АСТ; СПб.: Полигон, 2001. – 688 с.

14. Пипуныров, В. Н. История часов с древнейших времён до наших дней / В. Н. Пипуныров. М. : Наука. – 1982. – 495 с.

15. Рачков, М. Ю. История науки и техники: учебник для вузов / М. Ю. Рачков. – М. : Юрайт, 2022. – 297 с.

16. Афонасина, А. С. Измерение времени в античности: клепсидра и ее особенности (на материале письменных свидетельств и археологических данных из Амфиарайона) / А. С. Афонасина // Философское антиковедение и классическая традиция. 2016 г. – № 1. – Том 10. – С. 419–436.

17. Хёйзинга, Й. Осень Средневековья / Й. Хёйзинга. М. : Айрис-пресс, 2002 г. – 544 с.

18. Цыбульский, В. В. Календари и хронология стран мира / В. В. Цыбульский. – М. : Просвещение, 1982. – 128 с.